Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# ЭТНАГРАФІЯ

*Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці
1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**
*В. В. Калацэй*, загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*кафедра* тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;
*Т. І. Кухаронак*, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 20.05.2014 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.);
*навукова-метадычным* саветам па народнай творчасці вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 6 ад 06.11.2014 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. В. Калацэй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Этнаграфія» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор).

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Этнаграфія» прадугледжвае сувязь з іншымі дысцыплінамі: «Міфалогія», «Вусная народная творчасць», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Этнасеміётыка».

*Мэта* вывучэння дысцыпліны – раскрыць асаблівасці фарміравання матэрыяльнай, духоўнай і паводзінавай культуры беларусаў на розных этапах гістарычнага развіцця насельніцтва беларускіх тэрыторый.

*Задачы* дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– засвоіць веды па гісторыі фарміравання беларускага этнасу ў кантэксце гісторыка-культурных сувязей з суседнімі народамі;

– раскрыць патэнцыял этнічнай культуры для этнаэкалогіі беларусаў і для рэвіталізацыі іх нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

– сфарміраваць аналітычную кампетэнцыю даследчыкаў і пераемнікаў (забяспечыць разуменне спецыфікі і значнасці этнаграфічнай спадчыны для мадэлявання ўмоў яе захавання) у іх будучай прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– гісторыю этнакультурнага вывучэння беларусаў;

– асноўныя тэарэтычныя паняцці, разгледжаныя ў межах дадзенай дысцыпліны;

– сістэмы класіфікацый народаў свету і іх традыцыйнай матэрыяльнай культуры;

– асаблівасці матэрыяльнай традыцыйнай культуры беларусаў;

– этапы развіцця драўлянага дойлідства Беларусі;

– асноўныя народныя промыслы і рамёствы, тэхналогію іх вырабу і практычнае выкарыстанне;

– асаблівасці традыцыйнага беларускага касцюма згодна з даследаваннямі М. Раманюка;

– асаблівасці этнічнага абрадавага і паўсядзённага харчавання;

– пісьмовыя крыніцы па этнаграфіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– праводзіць самастойныя палявыя даследаванні матэрыяльнай культуры з мэтай фіксацыі лакальна-рэгіянальных асаблівасцей;

– адрозніваць народныя строі розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, вызначаць іх асаблівасці, колеравую гаму, арнаментальныя кампазіцыі;

– выкарыстоўваць у паўсядзённым побыце асобныя народныя рамёствы;

*валодаць:*

– сучасным тэрміналагічным слоўнікам навуковай і народнай тэрміналогіі па беларусазнаўстве і этнаграфіі;

– метадамі фіксацыі, вывучэння, архівавання і выдання помнікаў этнаграфіі;

– прыёмамі дакументавання фальклорных адзінак.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага фальклору і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– метад этнаграфічнага даследавання;

– метад уключанага назірання.

Засваенне адукацыйнай праграмы па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і творчых задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-4. Рыхтаваць даклады, паведамленні і іншую дакументацыю ў галіне народнай творчасці і ўдзельнічаць у іх рэпрэзентацыі.

ПК-8. Выкладаць спецыяльныя дысцыпліны, вывучаць перадавы педагагічны і творчы вопыт, творча карыстацца ім у сваёй педагагічнай дзейнасці.

ПК-17. На навуковай аснове арганізоўваць сваю творчую прафесійную дзейнасць, валодаць найноўшымі навуковымі распрацоўкамі, а таксама сучаснай інфармацыяй у сферы мастацкай культуры.

На вывучэнне дысцыпліны «Этнаграфія» ўсяго адведзена 234 гадзіны, з якіх 140 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 114 гадзін – лекцыі, 26 гадзін – семінары.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. зан. |
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Паняційны апарат этнаграфічнай навукі** | | | |
| *Тэма 1.* Этнаграфія як навука. Асноўныя паняцці этнаграфіі | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 2.* Станаўленне этнаграфіі і этнічнай антрапалогіі | 10 | 8 | 2 |
| *Тэма 3.* Агульная характарыстыка народаў свету | 12 | 10 | 2 |
| **Раздзел II. Этнаграфія Беларусі** | | | |
| *Тэма 4.* Этнагенез і этнічная гісторыя беларусаў | 10 | 8 | 2 |
| *Тэма 5.* Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне Беларусі | 12 | 10 | 2 |
| *Тэма 6.* Асаблівасці рассялення і тыпы паселішчаў беларусаў | 10 | 8 | 2 |
| *Тэма 7.* Традыцыйны грамадскі і сямейны побыт беларусаў | 10 | 8 | 2 |
| *Тэма 8.* Традыцыйная сістэма харчавання беларусаў | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 9.* Этнічныя меншасці Беларусі | 10 | 8 | 2 |
| **Раздзел III. Промыслы і рамёствы беларусаў** | | | |
| *Тэма 10.* Традыцыйная гаспадарчая дзейнасць і прылады працы | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 11.* Жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы беларусаў | 6 | 6 | |
| *Тэма 12.* Традыцыйны тэкстыль і адзенне беларусаў | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 13.* Традыцыйная кераміка Беларусі | 6 | 6 | |
| *Тэма 14.* Традыцыі апрацоўкі дрэва ў Беларусі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 15.* Традыцыі апрацоўкі металу ў Беларусі | 8 | 8 | |
| *Тэма 16.* Агульная характарыстыка традыцыйнай культуры беларусаў, яе вытокі і ахова | 8 | 6 | 2 |
| **Разам...** | **140** | **114** | **26** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Дэфініцыі «этнаграфія», «этналогія», «этнічная антрапалогія», іх этымалогія і значэнне. Стварэнне помнікаў матэрыяльнай культуры як складовая эстэтычнага пераасэнсавання Сусвету і як частка жыццезабеспячэння чалавека. Паходжанне асноўных відаў артэфактаў народнай культуры, іх выраб і навучанне вытворчым тэхналогіям. Вывучэнне этнаграфіі як умова захавання помнікаў нацыянальнай культурнай спадчыны, этнаэкалогіі і гарманічнага развіцця грамадства.

## Раздзел I. Паняційны апарат этнаграфічнай навукі

### *Тэма 1. Этнаграфія як навука. Асноўныя паняцці этнаграфіі*

Вызначэнне этнаграфіі і яе месца ў сістэме гуманітарных навук. Суадносіны этналогіі, этнаграфіі і этнічнай антрапалогіі: заходняя і айчынная традыцыя. Аб’ект і прадмет этнаграфіі. Роля этналагічных ведаў у светапогляднай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай і інш. сферах. Праблема крыніц у этнаграфіі. Метады этнаграфіі. Методыка палявой этнаграфіі. Спецыфіка этналагічнай інтэрпрэтацыі пісьмовых, музейных і інш. крыніц. Паняцці «этнічная культура», «традыцыйная культура». Культуры архаічныя, традыцыйныя і мадэрнізаваныя. Паняцце этнасу. Паняцце этнічнасці. Этнічныя працэсы. Асіміляцыя, кансалідацыя, міксацыя і інтэграцыя. Этнічная ідэнтычнасць. Этнічная гісторыя. Этнічная гісторыя зямлі. Этнаграфічныя навуковыя цэнтры Беларусі і свету. Этнаграфічныя музеі Беларусі і свету. Скансены. Этнаграфічная перыёдыка, энцыклапедыі і шматтомныя выданні. Этнаграфія і Internet.

### *Тэма 2. Станаўленне этнаграфіі і этнічнай антрапалогіі*

Уяўленні аб этнічным у старажытнасці і Сярэднія вякі. Падарожжы і Вялікія геаграфічныя адкрыцці. Роля каланіяльнай экспансіі XV–XX стст. у актуалізацыі этнаграфічных ведаў. Асветніцтва і этналагічная праблематыка. Рамантызм і абуджэнне інтарэсу да народнай культуры. Уплыў мовазнаўчых ідэй І. Гердэра, В. Гумбальта. Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. Эвалюцыянізм у этна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графіі. Л. Морган, Э. Тайлар і інш. Ідэі дыфузіянізму ў этнаграфіі. Ф. Ратцаль, Ф. Грэбнер і інш. Сацыялагічная школа. Фрэйдызм у этнаграфіі. Структуралізм і функцыяналізм. Б. Маліноўскі, А. Рэдкліф-Браўн, К. Леві-Строс. Амерыканская этнаграфія: школа Ф. Бааса, псіхалагічная канцэпцыя. А. Кардынер, Р. Бенедыкт і інш. М. Мід. Рэлятывізм. М. Херскавіц. Постмадэрнісцкія канцэпцыі. Неаэвалюцыянізм. Школа «культурнага матэрыялізму». Л. Уайт, Дж. Сцюард, М. Харыс і інш. Савецкія этналагічныя тэорыі. М. Кавалеўскі, С. Шыракагораў, М. Чэбаксараў, Ю. Брамлей, С. Токараў, Л. Гумілёў, С. Аруцюнаў і інш.

*Тэма 3. Агульная характарыстыка народаў свету*

Класіфікацыя народаў свету. Геаграфічная класіфікацыя. Паняцце айкумены. Абарыгеннае, аўтахтоннае, карэннае і прышлае насельніцтва. Рассяленне чалавецтва па зямлі ў гістарычнай рэтраспекцыі. Этнагаспадарчая класіфікацыя. Паняцце гаспадарча-культурнага тыпу. Паняцце тыпу (стратэгіі) жыццезабеспячэння ў заходняй навуковай традыцыі. Агульная характарыстыка комплексу культуры грамадстваў паляўнічых і збіральнікаў, ручных земляробаў, пастаралістаў, аграрных грамадстваў, грамадстваў з індустрыяльнай вытворчасцю прадуктаў харчавання. Лінгвістычная класіфікацыя. Моўныя сем'і народаў свету. Антрапалагічная класіфікацыя. Расавыя прыкметы. Характарыстыка вялікіх рас. Паняцце малой расы. Расізм у гістарычных і палітычных канцэпцыях: сацыял-дарвінізм, еўгеніка і інш.

## Раздзел II. Этнаграфія Беларусі

*Тэма 4. Этнагенез і этнічная гісторыя беларусаў*

Перыяды старажытнай гісторыі Беларусі: даіндаеўрапейскі, балтыйскі і славянскі. Усходнія славяне IX–X стст. Полацкае княства. Кіеўская Русь. Насельніцтва Беларусі ў складзе ВКЛ. Фарміраванне старажытнабеларускай мовы, асноўных рыс традыцыйнай беларускай культуры. Шырокае распаўсюджанне этнонімаў «русіны», «ліцвіны». Этнічная гісторыя беларусаў у XVII–XVIII стст. Этнічныя працэсы ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Працэс паланізацыі ў першай трэці XIX ст. Зараджэнне беларускай нацыянальнай ідэі. Назва «Беларусь» і этнонім «беларусы». Палітыка русіфікацыі ў другой палове

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XIX ст. Працэсы кансалідацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Беларускі этнас у межах Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР). Палітыка беларусізацыі 20-х гг. XX ст. Этнічныя працэсы на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Асаблівасці этнічнага жыцця Беларусі ў 40-я гг. XX ст. Этнічныя працэсы ў 50–80-я гг. XX ст. Другая хваля беларусізацыі ў XX ст. Беларускі этнас ва ўмовах самастойнай Рэспублікі Беларусь. Сучасныя этнічныя працэсы ў Беларусі.

*Тэма 5. Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне Беларусі*

Неаднароднасць культурнага ландшафту, багацце і разнастайнасць беларускай традыцыйнай мастацкай культуры. Адаптаванасць народнай культуры, побыту і гаспадарчай дзейнасці да мясцовага прыродна-геаграфічнага ландшафту, гістарычных умоў развіцця. Раяніраванне па дрэнажных басейнах рэк. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі: Падняпроўе, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе, Цэнтральная Беларусь, Падзвінне, Панямонне – гістарыяграфія назваў і этнакультурныя ўплывы на старажытнае насельніцтва. Лакальна-рэгіянальныя традыцыі: гаворкі, антрапалогія жыхароў, найбольш выбітныя звычаі і абрады. Палітра фарбаў нацыянальных строяў у залежнасці ад гісторыка-культурных рэгіёнаў. Суаднясенне адміністрацыйнага і этнаграфічнага раяніравання Беларусі.

*Тэма 6. Асаблівасці рассялення і тыпы паселішчаў беларусаў*

Гістарычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы рассялення беларусаў. Дысперсны (рассеяны) і кампактны характар рассялення. Выбар месца.

Гістарычныя тыпы сельскіх паселішчаў: вёска, сяло, слабада, аколіца, фальварак, засценак, хутар. Формы планіроўкі вёскі: скучаная, лінейная, вулічная. Мястэчка як пераходны тып ад сельскага да гарадскога паселішча.

Беларускія гарады: гісторыя ўзнікнення, этнасацыяльны склад насельніцтва, роля ў этнічным развіцці беларусаў.

*Тэма 7. Традыцыйны грамадскі і сямейны побыт беларусаў*

Сям’я як сацыяльны інстытут. Формы і структура сям’і. Становішча жанчыны ў сям’і. Прымацтва. Сямейнае звычаёвае права. Інстытут шлюбу. Шлюбны ўзрост. Царкоўны шлюб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падрыхтоўчы перыяд вяселля. Сватанне. Заручыны. Дзявоцкі вечар. Каравайны абрад. Вяселле. Вясельныя чыны. Пярэзвы. Пасаг маладой. Радзінныя звычаі і абрады. Перадродавая абраднасць. Радзіны. Хрышчэнне дзіцяці. Звычаі і абрады, звязаныя з разводам мужа і жонкі. Пахавальныя звычаі і абрады. Памінкі. Паняцце аб грамадскім ладзе жыцця. Сацыяльная структура беларускага этнасу ў розныя перыяды яго развіцця. Грамадскія інстытуты і нормы сацыяльных адносін. Звычаёвае права. Сельскі лад жыцця. Абшчынная форма сацыяльнай арганізацыі. Сельская абшчына, яе функцыі. Копны суд. Абшчынныя звычаі і абрады. Талака. Бонда. Сябрына. Адведкі. Вячоркі. Масавыя ігрышчы. Калядаванне, валачобніцтва, абрады купальскай ночы і іншыя каляндарна-вытворчыя абрады. Абрады, звязаныя з культам продкаў (Дзяды, Радаўніца). Карнавальная культура. Маскіраванне і абрадавае пераапрананне. Гарадскі лад жыцця.

*Тэма 8. Традыцыйная сістэма харчавання беларусаў*

Ежа як частка этнічнай культуры. Паняцце аб народнай кулінарыі. Гістарычная эвалюцыя беларускай кухні (асартымент прадуктаў, спосабы прыгатавання і ўжывання). Характар харчавання беларусаў. Раслінная (крупяныя, мучныя, стравы з агародніны) і жывёльная (малочныя, мясныя стравы) ежа. Традыцыйныя спосабы апрацоўкі прадуктаў. Часы прыёму ежы. Паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя стравы. Хлеб – аснова традыцыйнага харчавання беларусаў. Віды і сарты хлеба. Культура прыгатавання і спажывання хлеба. Бульба ў беларускай кухні (XVIII ст.). Разнастайнасць страў з бульбы. Традыцыйныя напоі, іх віды і месца ў сістэме харчавання.

*Тэма 9. Этнічныя меншасці Беларусі*

Этнічны склад Беларусі мяжы XX–XXI стст. Гісторыя міжэтнічных адносін на тэрыторыі Беларусі. *Рускія.* Міграцыя рускіх на тэрыторыю Беларусі. Стараверы ў Беларусі. Павелічэнне рускай этнічнай групы ў выніку асіміляцыйных працэсаў. *Палякі.* Гісторыя беларуска-польскага ўзаемадзеяння. Праблема паланізацыі беларусаў праз каталіцтва. Польская культура ў Беларусі. Сучасная статыстыка беларускіх палякаў. *Украінцы.* Праблема этнічнай мяжы паміж беларускім і ўкраінскім этнасамі. Палессе як пераходная зона. Кампактныя пасяленні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўкраінцаў на поўдні Беларусі. *Літоўцы*. Балцкія плямёны на тэрыторыі Беларусі. Балта-славянскія ўзаемадзеянні. Этнічныя працэсы ва ўмовах ВКЛ. Кампактныя літоўскія групы ў Беларусі. *Яўрэі.* Міграцыя яўрэйскага насельніцтва ў Беларусь. Мяжа яўрэйскай аседласці. Асноўныя гаспадарчыя заняткі і традыцыйна-бытавая культура. Грамадскае і рэлігійнае жыццё. *Татары*. Гісторыя першых пасяленняў у Беларусі. Традыцыйныя вераванні, звычаі, абрады. Асаблівасці гаспадаркі і матэрыяльнай культуры беларускіх татар. Згуртаванне «Аль-Кітаб» і яго дзейнасць. *Цыганы.* Агульныя звесткі пра цыган, іх паходжанне, этнічная спецыфіка. Вандроўны лад жыцця. Час з'яўлення на тэрыторыі Беларусі (XV ст.). Асаблівасці сацыяльнай арганізацыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры.

## Раздзел III. Промыслы і рамёствы беларусаў

*Тэма 10. Традыцыйная гаспадарчая дзейнасць і прылады працы*

Гаспадарка – аснова жыццядзейнасці этнасу. *Земляробства* як асноўны гаспадарчы занятак беларусаў. Эвалюцыя земляробства. Земляробчыя культуры: збожжавыя, агародныя (гародніна), тэхнічныя, садовыя культуры. Распаўсюджанне культурных раслін у Беларусі. Земляробчыя прылады працы. Тыпы сахі і барон. Цяглавая жывёла. Прылады збору і апрацоўкі ўраджаю. Гаспадарчыя памяшканні. Земляробчыя звычаі і абрады. *Жывёлагадоўля* і яе месца ў адаптацыі беларусаў. Структура жывёлагадоўлі ў Беларусі. Стойлавая гадоўля. Гаспадарчыя пабудовы для ўтрымання жывёлы. Працэс нарыхтоўкі і захавання кармоў. *Падсобныя промыслы і рамёствы*. Размежавальны сэнс паняццяў «промыслы» і «рамёствы». Значэнне промыслаў і рамёстваў як гаспадарчых заняткаў. *Старажытныя здабыўныя промыслы* на тэрыторыі Беларусі: збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, бортніцтва. Спосабы першаснай апрацоўкі, захавання і ўжывання ягад, грыбоў, траў і кветак. Роля рыбалоўства ў гаспадарцы беларусаў. Спосабы захавання рыбы. Маштабы паляўніцтва. Віды дзічыны. Прылады паляўніцтва. Спосабы палявання на буйных і дробных жывёл, на птушак. Бортніцтва як архаічная форма пчалярства. Пасечнае пчалярства. Прадукты пчалярства. *Саматужна-рамесная вытворчасць.* Хатняя вытворчасць і на продаж. Віды рамёстваў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дрэваапрацоўка, металаапрацоўка, ганчарства, гарбарства, ткацтва, пляценне і інш. Народныя мастацкія промыслы. *Беларускі кірмаш.* Месца і час правядзення. Спецыялізаваны і ўніверсальны гандаль. Кірмашовыя забавы.

*Тэма 11. Жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы беларусаў*

Арганізацыя жыццёвай прасторы. Сядзіба (двор) і сядзібныя пабудовы. Тыпы сялянскіх сядзіб. Вяночны і пагонны двор. Двор з нязлучанымі пабудовамі. Эвалюцыя сялянскага жылля. Планіроўка сялянскай хаты. Курная хата. Печ без коміна. Унутраны выгляд жылога памяшкання, традыцыйная мэбля (інтэр'ер хаты). Хата з комінам. Змены ў інтэр'еры народнага жылля ў канцы XIX – пачатку XX ст. Асаблівасці беларускага народнага дойлідства. Будаўнічыя матэрыялы, інструменты, прыёмы. Будаўнічыя канструкцыі: зрубная, каркасная (слупавая). Фундамент. Дахі, іх формы і канструкцыі. Дэкор у народным дойлідстве. Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і. Выбар месца для жылля, падрыхтоўка будаўнічых матэрыялаў, пачатак і заканчэнне будаўніцтва. Свята ўваходзін. Гаспадарчыя пабудовы: хлеў, адрына (сянніца, пуня), павець, свіран, клець, варыўня (істопка), склеп (пограб), гумно (клуня, стадола), сушня (асець), азярод. Традыцыйныя вясковыя вытворчыя і бытавыя збудаванні: млыны, кузні, вяндлярні, корчмы, лазні. Малыя формы ў беларускім дойлідстве: агароджы, брамы, студні (калодзежы).

*Тэма 12. Традыцыйны тэкстыль і адзенне беларусаў*

З'яўленне тэкстылю ў неаліце. Адзенне як частка матэрыяльнай культуры этнасу. Функцыі адзення: утылітарна-практычная, эстэтычная, абрадавая, ідэнтыфікацыйная (вызначэнне прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай, этнічнай, рэлігійнай групы). Мужчынскае і жаночае адзенне. Паўсядзённае і святочнае адзенне. Абрадавае адзенне. Матэрыялы. Колеравая гама. Спосабы ўпрыгожвання. Гістарычная эвалюцыя беларускага народнага адзення. Комплекс мужчынскага адзення: нацельнае адзенне, верхняе адзенне, абутак, галаўныя ўборы. Дэкор мужчынскага касцюма. Комплекс жаночага адзення: кашуля, паясное адзенне, безрукаўка (гарсэт), галаўныя ўборы, абутак, верхняя вопратка. Асноўныя віды крою кашуль. Аздабленне жаночага касцюма. Асаблівасці дзіцячага і юнацкага адзення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шляхецкае адзенне. Гарадскі касцюм другой паловы XIX – пачатку XX ст. і яго ўплыў на традыцыйнае сялянскае адзенне.

*Тэма 13. Традыцыйная кераміка Беларусі*

З’яўленне тэхналогій вырабу керамікі на беларускіх тэрыторыях у неалітычныя часы. Археалагічныя культуры штрыхаванай керамікі, лейкападобных кубкаў. Ганчарства ў Беларусі. Этнаграфічныя рэгіёны Беларусі і варыятыўнасць яе керамікі. Кераміка гартаваная, абварная, распісная, васкаваная, дымленая і паліваная. Керамічны посуд і керамічныя побытавыя рэчы. Кераміка ў этнакультурным выхаванні. Керамічныя музычныя інструменты, керамічныя цацкі.

*Тэма 14. Традыцыі апрацоўкі дрэва ў Беларусі*

Выкарыстанне дрэва ў традыцыйнай архітэктуры і дэкаратыўны аспект дрэваапрацоўкі. Разьба па дрэве ў культавым і палацавым дойлідстве сярэдневяковай і адраджэнскай Беларусі, беларускім барока і класіцызме – яе традыцыйны аспект. Драўляныя транспартныя сродкі для транспарціроўкі па сушы і па вадзе. Драўляны посуд і хатнія прылады беларусаў. Выраб з дрэва традыцыйных музычных інструментаў: дудкі, парных дудак, гудка і скрыпкі, гусляў, колавай ліры, драўляных частак дуды, цымбалаў. Рэвіталізацыя старажытных тэхнік апрацоўкі дрэва ў XX–XXI стст.

*Тэма 15. Традыцыі апрацоўкі металу ў Беларусі*

Індаеўрапейскія вытокі апрацоўкі металу і кавальства. Першыя вырабы з металу – медныя і бронзавыя амулеты і ўпрыгожванні балтыйскіх плямён на тэрыторыі Беларусі. Выраб з металу прылад працы і зброі ў эпоху бронзы, антычныя часы і ў Сярэдневякоўі. Вобраз каваля ў беларускім фальклоры. Каваныя прылады працы ў сельскай гаспадарцы, хатнім побыце і ў эстэтычным аздабленні жылля. Каваныя крыжы Беларусі ў культавым дойлідстве і абрадавай культуры яе вясковых асяродкаў.

*Тэма 16. Агульная характарыстыка традыцыйнай культуры беларусаў, яе вытокі і ахова*

Жыццёва-гаспадарчыя і рытуальныя запатрабаванні земляробаў і жывёлаводаў як аснова фарміравання матэрыяльнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры беларусаў. Гендарныя адрозненні ў фарміраванні матэрыяльнага свету носьбітаў традыцыйнай культуры. Актуальнасць традыцыйнай матэрыяльнай культуры ў XXI ст. Неабходнасць аховы помнікаў матэрыяльнай культуры і помнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якімі з’яўляюцца тэхналогіі народных рамёстваў для этнаэкалогіі беларусаў. Ахоўныя спісы гісторыка-культурнай спадчыны, нематэрыяльнай культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і ЮНЕСКА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Беларусы: Этнаграфія. Дэмаграфія. Дыяспара. Канфесіі : атлас / рэд. С. А. Польскі. – Мінск : Кам. дзярж. знакаў пры М-ве фінансаў РБ, 1996. – 32 с.

*2. Итс, Р. Ф.* Введение в этнографию : учеб. пособие / Р. Ф. Итс. – Л. : ЛГУ, 1991. – 168 с.

*3.* Музей старажытнабеларускай культуры : дапам. для наведвальнікаў / пад рэд. В. Ф. Шматава. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – С. 3–120, 200–235.

*4.* Основы этнографии : учеб. пособие для ист. спец. вузов / под ред. С. А. Токарева. – М. : Высш. шк., 1968. – 358 с.

*5.* Помнікі этнаграфіі : Методыка выяўлення, апісання і збірання / рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 150 с.

*6. Раманюк, М.* Беларускае народнае адзенне : фотаальбом / М. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – 317 с.

*7. Токарев, С. А.* Истоки этнографической науки (До середины XIX в.) / С. А. Токарев. – М. : Наука, 1978. – 167 с.

*8. Токарев, С. А.* История зарубежной этнографии : учеб. пособие для вузов по спец. «история» / С. А. Токарев. – М.: Высш. шк., 1978. – 352 с.

*9. Хвир, Н.* Состояние и проблемы охраны нематериального культурного наследия Республики Беларусь / Н. Хвир // Аўтэнтычны фальклор : праблемы вывучэння, захавання, перайманя : зб. навук. прац удзельнікаў III Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 крас. 2009 г. / БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2009. – С. 34–35.

*10. Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына : Беларусь. Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 1996. – 208 с.

*11.* Этнография : учебник / под ред. Ю. В. Бромлея, Г. Е. Маркова. – М. : Высш. шк., 1982. – 320 с.

*12.* Этнология : учебник / Э. Г. Александренков, Л. Б. Заседателева, Ю. И. Зверева [и др.]. – М. : Наука, 1994. – 383 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Аверкиева, Ю. П.* История теоретической мысли в американской этнографии / Ю. П. Аверкиева. – М. : Наука, 1979. – 288 с.

2. Беларусы : у 8 т. Прамысловыя і рамесныя заняткі / рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, В. С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – Т. 1. – 351 с.

3. Беларусы : у 8 т. Дойлідства / А. І. Лакотка. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – Т. 2. – 389 с.

4. Беларусы : у 8 т. Гісторыя этналагічнага вывучэння / В. К. Бандарчык. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – Т. 3. – 365 с.

5. Беларусы : у 8 т. Вытокі і этнічнае развіццё / рэдкал.: В. К. Бандарчык, І. У. Чаквін, І. Р. Углік. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 4. – 433 с.

6. Беларусы : у 8 т. Сям’я / рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, Г. М. Курыловіч. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 5. – 375 с.

7. Беларусы : у 8 т. Грамадскія традыцыі / рэдкал.: В. М. Бялявіна, М. Ф. Піліпенка, І. У. Чаквін. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – Т. 6. – 606 с.

8. *Бандарчык, В. К.* Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. / В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1964. – 282 с.

9. *Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 270 с.

10. *Думін, С. У.* Беларускія татары : Мінулае і сучаснасць / С. У. Думін, І. Б. Канапацкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 206 с.

11. *Кухаронак, Т. І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў : канец XIX – XX ст. / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 125 с.

12. *Жлоба, С. П.* Полевая этнография : Теория и практика полевых этнографических исследований : пособие для студентов вузов / С. П. Жлоба ; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. – Брест : БрГУ, 2001. – 186 с.

13. *Лурье, С. В.* Историческая этнология : учеб. пособие для вузов / С. В. Лурье. – М. : Гаудеамус : Акад. проект, 2004. – 622 с.

14. Народы и религии мира : энцикл. / ИЭА РАН ; гл. ред. В. А. Тишков. – М. : Большая рос. энцикл., 2000. – 926 с.

15. *Чебоксаров, Н. Н.* Народы. Расы. Культуры / Н. Н. Чебоксаров, И. И. Чебоксарова. – 2-е изд., доп. ; ред. Ю. В. Бромлей. – М. : Наука, 1985. – 272 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Чеснов, Я. В.* Лекции по исторической этнологии / Я. В. Чеснов. – М. : Гардарики, 1998. – 400 с.

*17. Эванс-Причард, Э.* История антропологической мысли / Э. Эванс-Причард. – М. : Вост. лит., 2003. – 358 с.

*18.* Этнология : учеб. пособие / под ред. Е. В. Миськовой, Н. Л. Мехедова, В. В. Пименова. – М. : Акад. проект : Культура, 2005. – 624 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказчыкі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з’яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з’яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (асаблівасцей фарміравання матэрыяльнай, духоўнай і паводзінавай культуры беларусаў на розных этапах гістарычнага развіцця). Веданне даследчай і навукова-метадычнай літаратуры |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (асаблівасцей фарміравання матэрыяльнай, духоўнай і паводзінавай культуры беларусаў на розных этапах гістарычнага развіцця), веданне структуры аналізу навучання. Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб’ектаў вывучэння, раскрыццё праблем этнаграфіі, фармуліроўка вывадаў. Уменне аналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў фарміравання матэрыяльнай, духоўнай і паводзінавай культуры беларусаў на розных этапах гістарычнага развіцця. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць структуру этнаграфічнай культуры, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай па акрэсленых пытаннях. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем фарміравання матэрыяльнай, духоўнай і паводзінавай культуры беларусаў на розных этапах гістарычнага развіцця. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў аховы этнаграфічнай культуры на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы этнаграфічнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па этнаграфіі, праблемах і тэндэнцыях аховы этнаграфічнай культуры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах;

– залік;

– экзамен.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і экзаменаў.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па агульным напрамку «станаўленне этнаграфіі і этнічнай антрапалогіі» па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па курсе.

## Формы выканання самастойнай работы:

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі).

## Прыкладныя тэмы для самастойнай работы:

1. Збіранне этнаграфічных звестак у Антычнасці і Сярэдневякоўі і ўяўленні пра народы свету ў гістарычнай літаратуры і мастацтве тых часоў.

2. Эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў і ўяўленні пра народы свету ў гістарычнай літаратуры і мастацтве тых часоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Асветнікі XVIII ст. пра народазнаўства.
4. Асноўныя кірункі этнаграфіі XIX–XX стст.
5. Асноўныя кірункі этнічнай антрапалогіі XIX–XX стст.
6. Старажытная гісторыя Беларусі.
7. Станаўленне і развіццё беларускай народнасці.
8. Кансалідацыя і самавызначэнне беларусаў у XIX ст.
9. Кансалідацыя і самавызначэнне беларусаў у XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЭТНАГРАФІЯ**

*Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,28. Ул.-выд. арк. 0,77. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ